# ВЫСТАЎКА У БІБЛІЯТЭЦЫ

У чытальнай зале Беларускай дзяржаўнай бібліятэкі імя Леніна адкрылася вялікая выстаўка літаратуры да 31-й гадавіны Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі. На некалькіх стэндах размешчана больш 150 экспанатаў: кнігі, часопісы, фотадакументы.

Вялікую цікавасць прадстаўляе зборнік дакументаў партархіва ЦК КП(б)Б «Крах нямецкай акупацыі ў Беларусі ў 1918 годзе».

Даведачна-бібліяграфічны аддзел бібліятэкі падрыхтаваў рэкамендацыйны спіс літаратуры да 31-й гадавіны Кастрычніка.